На основе данных, полученных при расчетах по данной методике, можно (соотнеся их с реальными производственными и сбытовыми возможностями предприятия) сделать вывод о перспективах реструктуризации по выбранной модели.

Это особенно важно, т. к. реструктуризация предприятий, проводимая в условиях переходной экономики, характеризуется тем, что она направлена на решение наиболее острых экономических и финансовых проблем в краткосрочном периоде. Результатом ее является создание условий, при которых предприятия из зоны убытков переходят в зону получения стабильных потоков доходов, становятся инвестиционно привлекательными.

ЛИТЕРАТУРА

1. Крачковский А.П. Применение модели «затраты–выпуск» при обосновании реструктуризации предприятий // Труды БГТУ. Сер. эконом. и управления. – Минск: БГТУ, 2002. – Вып. X. – С. 100–102.
2. Леонтьев В. В. Межотраслевая экономика. – М.: Экономика, 1997. – 479 с.

УДК 330.35

У.А. Кулажанка, д-р экан. навук, прафесар; А.А. Пузырэўская, аспірант

**ЯК ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ЭКАНАМІЧНЫ РОСТ?**

This article is dedicated to the question of maintaining of economic stability and growth in Belarus on the base of latest economic data's analysis.

Як вядома, 2002 г. не прынёс Беларусі і яе народу чакаемых вынікаў. Улады сцвярджаюць, што палова паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця засталася нявыкананай. Праўда, галоўны эканамічны паказчык – вытворчасць ВНП – нібы ўзрос на 4% замест 6% па прагнозу. Але гэты рост не павінен нас супакойваць, бо, з аднаго боку, на працягу года крэдыторская запазычанасць вытворцаў узрасла на 2,6 трлн. рублёў і дасягнула астранамічнай велічыні – 10,7 трлн. рублёў, а з другога – гара нерэалізаваных тавараў перавысіла 1 трлн рублёў. Значыць, нарошчвалі вытворчасць у пазыку, а нарошчанае не знаходзіла збыту ў значнай сваёй частцы і скіроўвалася на склад. Да таго ж, пэўна, зусім не ад працвітання за мінулы год запазычанасць прадпрыемстваў рэальнага сектара перад бюджэтам вырасла на 43%.

Леташні год быў характэрны далейшым заняпадам сельскай гаспадаркі. Прырост сельскагаспадарчай вытворчасці ўсіх формаў гаспадарання дасягнуў дзесь толькі каля 1%. І гэта нягледзячы на шматмільярдныя крэдытныя ды фінансавыя ўліванні ў калгасна-саўгасную сістэму. Адразу адзначым: папракаць улады ў тым, што яны аказваюць дапамогу гаспадаркам, не варта, бо гэта сусветная практыка. У ЗША, напрыклад, сельская гаспадарка па памерах фінансавання знаходзіцца на другім месцы: адразу пасля касмічных праграмаў. Але справа ў тым, што на Захадзе эканамічная дапамога аказваецца не праз пасрэднікаў, як у нас, а адразу вытворцам. Там зыходзяць з таго, што вытворчасць прадуктаў харчавання ёсць асноўная падстава фарміравання высокага жыццёвага ўзроўню народа. Са сказанага вынікае наступнае: каб забяспечыць рост сельскагаспадарчай вытворчасці, без якога немагчымы эканамічны рост у цэлым, трэба сярод іншых арганізацыйных і юрыдычных формаў змяніць фінансаванне сельскай гаспадаркі ў адрасным і гаспадарчым планах.

Трэба аддаць вартае колам улады, якія занепакоены станам гаспадаркі. На спецыяльнай нарадзе ў Прэзідэнта, якая адбылася на пачатку лютага, А. Лукашэнка запатрабаваў ад улад у двухмесячны тэрмін пераадолець усе хібы, якія былі дапушчаны на працягу папярэдняга года ў справе кіраўніцтва эканомікай. Гэта прывяло да таго, што палова паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны летась не была выканана. Цяжка ўявіць, што гэта патрабаванне будзе выканана за такі кароткі тэрмін. Сёння трэба ствараць пэўную эканамічную базу для эканамічнага росту. Такой базы пакуль няма. Размова ідзе пра памер інвестыцый, якія на дадзены момант абмежаваны толькі слабымі ўнутранымі фінансавымі рэзервамі, ды і яны, на жаль, скарачаюцца. Так, калі ў 1998 г. інвестыцыі складалі 14% ад ВУП, то летась яны скараціліся да 9%, што вельмі мала. Іх адносную велічыню трэба падвоіць, а абсалютную – нарасціць яшчэ больш.

Спадзявацца на знешняе крэдытаванне, тым больш фінансаванне з боку суседняй Расіі, няма падстаў. Расія сядзіць на нафтавай іголцы, і таму яе актыўны знешнегандлёвы баланс перавысіў летась 50 млрд. дал. Але нягледзячы на гэтыя вялікія грошы прырост ВУП у 2002 г. у Расіі, як і ў Беларусі, склаў толькі 4%. Гэта сведчыць аб хворым рэальным сектары. Як толькі крызіс вакол Ірака спыніцца і знізяцца цэны на нафту, Расія не ў стане будзе забяспечыць рост гаспадаркі нават на 4%, тым больш што ў ёй не вырашаны сацыяльныя праблемы: штогод мёрзне Усход і Паўночны Захад, а 34 млн. чалавек, паводле існуючых даных, жывуць за рысай беднасці. Справа ў тым, што размеркаванне даходаў у Расіі, як сцвярджае ў сваёй кнізе «Эканоміка развіцця» расійскі акадэмік-эканаміст Дз. Львоў, ажыццяўляецца як амаральная акцыя: 20% даходаў размяркоўваецца на капітал, 75% у форме рэнты, якую захапілі алігархі і былая наменклатура, і толькі 5% даходаў – даход па працы. Такое размеркаванне небяспечнае рэвалюцыйным выбухам. Не выпадкова акадэмік Львоў перасцерагае, што «гэта ў вышэйшай ступені амаральная акцыя разбурае гістарычнае ўяўленне людзей аб сацыяльным міры і справядлівасці, зафіксаваныя ў свяшчэнных паданнях народа. Адсутнасць роўнага доступу для ўсіх да таго, што ў Расіі ад Бога, з'яўляецца найцяжэйшым грахом. ... Не замаліўшы гэтага граха, мы ніколі не зможам забяспечыць будучае нашай краіны, яе народа».

Ёсць нямала грахоў і ў Беларусі, якія таксама трэба замольваць. Але пры ўсім гэтым неабходна шукаць выйсце са складанага становішча і забяспечыць эканамічны рост у краіне. Галоўнае ў тым, каб знайсці сродкі для інвестыцый унутры краіны. Тым больш што яны ёсць, хоць і ў недастатковай колькасці. Гаворка ідзе пра зберажэнні дамашніх гаспадарак. На Захадзе тэорыя ўдзелу дамашніх гаспадарак ва ўзнаўленчым працэсе распрацавана глыбока і комплексна. У нас жа пакуль не. І гэта пры тым, што якраз дамашнія гаспадаркі валодаюць усімі рэсурсамі. У іх руках грошы, рабочая сіла, капітал і зямля. Калі ўзяць беларускія дамашнія гаспадаркі, то летась яны зберaглі 1,6 млрд. дал. Але дзе яны? На жаль, толькі часткова ўкладзены ў вытворчасць праз дэпазіты ў камерцыйныя банкі, а затым крэдытаванне інвестыцый. Астатнія зберагаюцца дома і ніяк не задзейнічаны ў грамадскай гаспадарцы. Адсюль вынікае, што ўрад і яго структуры разам з банкаўскай сістэмай павінны стварыць усе ўмовы, каб дамашнія гаспадаркі ахвотна і зацікаўлена ўкладвалі свае зберажэнні ў інвестыцыйны працэс. Гэта ўстанаўленне станоўчай стаўкі працэнта па дэпазітах з улікам інфляцыі, гарантыя дывідэнтаў па акцыях і г. д.

Другой крыніцай інвестыцый можа быць дзяржаўнае фінансаванне. Дзеля гэтага дзяржава павінна поўнасцю адмовіцца ад перакрыжаванага фінансавання жыллёвых і

транспартных паслуг. У гэтым плане трэба адобрыць яе палітыку па паступоваму павышэнню тарыфаў за жыллё, платы за грамадскі транспарт і г. д., бо гэта ёсць пачатак пераходу да рынку – за ўсё трэба плаціць спаўна. Але гэтага нельга рабіць за кошт зніжэння жыццёвага ўзроўню народа, што назіраецца ў Беларусі на пачатку 2003 г. Трэба аднячасова павышаць заработную плату і пенсіі, каб людзям было чым плаціць.

У краіне ўведзена столькі новых падаткаў і плацяжоў, што памеры ценявой эканомікі, якія дасягнулі сёння каля 40% агульнай сумы даходаў насельніцтва, не скарачаюцца, а хутчэй растуць. Таму ўпарадкаванне падаткаабкладання ў накірунку скарачэння ліку ўсякіх плацяжоў, а галоўнае іх агульнай сумы, павінна прывесці да легалізацыі эканомікі і павышэння збораў грошай у казну. Усё гэта можа прывесці да росту фінансавання інвестыцый з боку дзяржавы.

Нарэшце, невычэрпнай крыніцай росту даходаў насельніцтва, а значыць, зберажэнняў і іх накіравання ў вытворчасць можа быць інтэнсіўнае развіццё прадпрымальніцтва ў краіне. На сёння зарэгістравана дзесь 32 тысячы прадпрымальнікаў і прадпрымальніцкіх структураў. Гэта ў 5–6, а можа і ў 10 разоў менш, чым трэба і можа быць эфектыўнай рэальнасцю.

А ў дадатак, прырост рэсурсаў для інвестыцый можа даць правядзенне аграрнай рэформы, якая зноў затармазілася. Размова не ідзе пра тое, каб скараціць фінансаванне сельскай гаспадаркі і зэканоміць на гэтым сродкі для інвестыцый. Хутчэй за ўсё такое фінансаванне будзе ўзрастаць. Але разам з тым яшчэ ў большай меры пачне развівацца сельская гаспадарка, што дасць прыток інвестыцыйных рэсурсаў у розных формах: як праз дамашнія гаспадаркі, так і дзяржаўнае фінансаванне.

## ЛІТАРАТУРА

1. Львов Д. Экономика развития. – М., 2002. – С. 155.

УДК 339.138

О.В. Савич, ассистент

# СТРАТЕГИИ КОНКУРЕНТНЫХ ПРЕИМУЩЕСТВ

This article tells how to choose marketing strategies in order to achieve a sustainable competitive advantage.

Конкуренция – это один из главных источников маркетинговых возможностей. Чтобы воспользоваться такой возможностью, следует добиться конкурентного преимущества, т. е преимущества над конкурентом, предложив большую ценность потребителям. Большая ценность – это предложение потребителям товаров или услуг больших преимуществ или тех же преимуществ при более низкой, чем у конкурентов, цене. При выборе маркетинговой стратегии целесообразно оценить рынки сбыта по следующим критериям: 1) степень привлекательности рынка в качестве объекта для получения преимуществ; 2) слабые и сильные стороны конкурентов на рынке; 3) способность компании добиться преимуществ над конкурентами. Выделяют несколько факторов, определяющих привлекательность рынка как источника конкурентного преимущества: препятствия на пути доступа на рынок; острота конкуренции; наличие товаров-заменителей из других отраслей; влияние потребителей; влияние поставщиков. Первые два фактора – препятствия на пути доступа на рынок и